View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

**Т.М. Тарасава**

# Актуальнасць духоўнага патэнцыялу “Новай зямлі” Якуба Коласа на мяжы XX—XXI стагоддзяў

Цікавасць да чалавека надзвычай востра актуалізавалася на мяжы XX—XXI стст., у эпоху катастрафічнага руйнавання навакольнага асяроддзя, гонкі ядзернага ўзбраення, абвастрэння псіхалагічных праблем у тэхнагенным грамадстве. Новае стагоддзе, як і папярэдняе, задаецца ўсё тым жа Коласавым пытаннем: *“...о, вечнасць, вечнасць! // Як зразумець цябе і змерыць? // І каго слухаць? каму верыць?”* [2, с. 291].

Пастаноўка праблемы духоўнай свабоды заўсёды мае дачыненне да праблемы выбару чалавекам жыццёвага шляху і каштоўнасных арыенціраў. Цікавасць літаратуры да пытанняў духоўнай свабоды найперш звязана з асобай Ф.М. Дастаеўскага, які глыбока спалучаў у сваіх творах праблему духоўнай свабоды і маральнага выбару з тонкім псіхалагічным аналізам учынкаў і матываў герояў. Руская радыкальна-сацыяльная думка XIX ст. (Пісараў, Дабралюбаў і інш.), французская літаратура ў асобе Бальзака, Стэндаля, Мапасана звяртала найперш увагу на пытанні сацыяльнай свабоды і ад іх вырашэння бачыла перспектывы маральнага развіцця асобы. Этычныя пошукі мастацтва слова і філасофскай думкі XX ст. былі скіраваны на пошук сінтэзу і гармоніі паміж гэтымі аспектамі свабоды, толькі ў час вялікіх гістарычных сацыяльных зрухаў праблема аказалася невырашальнай. У свой час рускі філасоф М. Бярдзяеў акцэнтаваў увагу на праблеме свабоды менавіта ў яе духоўным аспекце. Ён гаварыў аб трагізме духоўнай свабоды і магчымасцях яго вырашэння праз любоў: ”Человек есть личность не по природе, а по духу. <…> Личность связана с любовью. <…>  Любовь есть путь реализации личности” [1, с. 47].

Якуб Колас у “Новай зямлі” трагічны кампанент свабоды бачыў у стасунках асобы і грамадства. Увогуле беларуская літаратура пачатку XX ст. (творы Янкі Купалы, Якуба Коласа, М. Гарэцкага і інш.) арыентавалася на комплекснае вырашэнне сацыяльнай, рэлігійнай і духоўнай свабоды. Нацыянальнае мастацтва слова арганічна спалучала дылему асобаснага і сацыяльнага падыходаў да разгляду праблемы свабоды (праўда, часам літаратура больш арыентавалася на вырашэнне пытання сацыяльнай свабоды і толькі з ёй звязвала маральнае

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўдасканаленне чалавека). Сусветнае экзістэнцыяльна арыентаванае пісьменства ХХ ст. падкрэслівала прыярытэт асобаснага пачатку, а класікі беларускай літаратуры шукалі сінтэз і гармонію паміж сацыяльным і асобасным, толькі, праўда, гарманічнага спалучэння не атрымлівалася па прычыне вялікіх сацыяльных зрухаў.

У аснове духоўнага жыцця чалавека ў шматлікіх яго праявах ляжыць свабода, менавіта яна выступае крытэрыем адпаведнасці духоўнага жыцця асобы яе анталагічнай сутнасці. Узаемадэтэрмінацыя свабоды і духоўнага жыцця дае магчымасць цэласнага падыходу да аналізу быцця чалавека з улікам яго сацыяльнай і прыроднай іпастасі, але аснову сутнасці чалавека складае менавіта духоўнае жыццё. Толькі ў духоўным жыцці, імкнучыся да абсалютных норм, да найвышэйшага Духу, чалавек рэалізуе сваю духоўную сутнасць.

Свабода з'яўляецца ўнікальнай якасцю асобы і можа разглядацца ў двух планах: філасофскім (духоўным) і сацыяльным плане, звязанным з існаваннем чалавека ў грамадстве. Найбольш глыбокім і складаным выступае першы план. Філасофская рэфлексія свабоды адчувальна паўплывала на ўсю мастацкую літаратуру ХХ ст. Менавіта літаратура, у цэнтры якой знаходзіцца асоба з усімі супярэчнасцямі быцця, дазваляе раскрыць этычны складнік свабоды, яе маральнае напаўненне. Адчуванне чалавекам унутранай свабоды робіць яго творцам, акрыляе, напаўняе жыццё сэнсам. Духоўная свабода, арганічна спалучаная з такімі паняццямі, як вера, сумленне, доўг, любоў, адказнасць, вызначае адносіны чалавека да высокіх і нізкіх каштоўнасцей.

Праблема духоўнай свабоды ніколі не губляе сваёй актуальнасці яшчэ і таму, што мае дачыненне не толькі да асобы чалавека, але і да грамадства. Праяўляючыся ў розных сферах жыцця, свабода заўсёды ляжыць у аснове ўсіх маральных якасцей асобы. Свабода — катэгорыя дуалістычная (з'яўляецца адначасова “станоўчай” і “адмоўнай”) і спалучае ў сабе два ўзаемаперацякальныя пачаткі — дабро і зло. Яе дуалістычнасць найглыбей выяўляецца ў вобразе Міхала з “Новай зямлі” Якуба Коласа. Парадаксальнасць духоўнай свабоды героя ў рэальным жыцці праяўляецца ў цалкам палярным адрозненні паміж тым, чаго ён жадае, і тым, што атрымлівае. Гэта абумоўлена духоўнай непадрыхтаванасцю суб'екта: зададзенай мэтай без уліку ўсіх абставін часу.

Беларускі пісьменнік сутнасць асобы бачыць менавіта ў духоўным жыцці, якое вызначаецца маральным выбарам, імкненнем да дабра і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

непрыманнем зла. У жыцці кожнага чалавека заўсёды цесна параплятаюцца дабро і зло. Якуба Коласа як мастака цікавіць, як герой робіць свой выбар і ці парушае пры гэтым маральны закон. Маральныя выпрабаванні, праз якія праходзіць Міхал, падымаюць яго на больш высокую ступень духоўнага развіцця.

Клопат аб набыцці зямлі маральна загартоўвае Міхала, што дае яму адчуванне ўнутранай свабоды і права перайначыць свой лёс. Свядомасць героя як праяўленне яго духоўнай сутнасці ўмацоўвае ў ім пачуццё адказнасці за лёс сямейнікаў, за душэўны камфорт дома, жаданне самому вызначаць жыццёвы шлях. Але свабодныя духоўныя памкненні Міхала Якуб Колас звязаў з прычынна-выніковымі сувязямі рэчаіснасці, якая жорстка стрымлівала героя: *“Так, многа клопатаў з зямлёю! // Як цяжка голаю рукою // Рабіць, вясці такія справы! // І больш той гутаркі і славы, // І гэтай зайздрасці і плётак // Дзядзькоў дасужых і іх цётак // І ўсіх наогул сваякоў, // Бо чалавек ужо такоў, — // Ну, больш галасу, чым карысці. // Ох, цяжка, цяжка ў людзі выйсці // І моцна стаць на свае ногі, // Бо многа ў свеце вас, парогі”* [2, с. 284–285]. Такім чынам Якуб Колас арганічна спалучыў праяўленне свабоды свядомасці і яе дэтэрмінаванасць.

Пісьменнік пакідае за Міхалам права свабоднага выбару жыццёвага шляху. Міхал свядома ставіць перад сабой мэту, свядома спрабуе яе ажыццявіць, і нават у неспрыяльных сацыяльных абставінах герой духоўна развіваецца, бо ён робіць маральны выбар, і гэты выбар на дабро для сваёй сям'і: *“Каб цень развеяць тыя смуты: // — І трэба часам крыж пакуты // Панесці, мілыя мае вы, // Зазнаць і гора, неспадзевы! // Але раз ты наважыў дзела, // Ідзі станоўка, роўна, смела, // Ідзі, назад не аглядайся // І на другіх не паглядайся!”* [2, с. 285–286].

Тургенеўскі Базараў казаў: “Человек хорош, обстоятельства плохи”. Сапраўды, рэчаіснасць пачатку ХХ ст. выклікала смутак і боль, літаратура пра гэта пісала, але змаганне з абставінамі засланяла пытанне аб сутнасці чалавечай прыроды. Як жа праяўляецца імкненне Міхала да свабоды? Пошук перамен у “Новай зямлі” адбываецца адначасова з пераездамі/міграцыяй на новае месца жыхарства, паездкай на Случчыну на агляд зямлі, у віленскі зямельны банк. Міграцыя пашырае ўзровень бытавання герояў, умацоўвае ў іх “вірус” бунту, што ў сваю чаргу абвастрае разуменне неабходнасці свабоды. Вымушаныя пераезды актывізуюць думку, узбагачаюць героя дадатковым вопытам, падштурхоўваюць яго да набыцця большай свабоды. Кожны новы пераезд

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сям'і звязаны са стратамі і з ідэяй катастрафізму (пажар, зямлянка). Прывязанасць герояў да абжытага месца, да рэчаў — у гэтым і ёсць пэўнае праяўленне несвабоды, але яно не пярэчыць памкненням героя шукаць свой кут. Пярэбары толькі ўмацоўваюць жаданне Міхала набыць сваю зямлю: *“Купіць зямлю, прыдбаць свой кут, // Каб з панскіх выпутацца пут, // А там зажыць сабе нанова: // Свая зямля — вось што аснова!”* [2, с. 67].

Асэнсаванне Міхалам і Антосем сэнсу быцця і мэты дасягнення ўнутранай свабоды адкрывае героям перспектыву для ўнутранага росту, перамогі над жыццёвымі клопатамі, для поўнага адмаўлення мінулага існавання, адкрывае новыя гарызонты для самаўдасканалення і ўспрымання сябе як важнага звяна жыццябудовы. Менавіта пачуццё ўласнай свабоды і годнасці выводзіць герояў Якуба Коласа на сацыяльную праблематыку: *“Міхал маўчаў, ды нечакана // Ён сам як рушыцца да пана!.. // Ляснічы зразу ўзад падаўся… // — Чаго пан гэтак раскрычаўся? // Завошта пан мяне так лае? // Згарыць яна няхай такая // І служба гэта, і пасада, // І гэта крыўда, й гэта здрада, // І гэта панская адплата!.. // Няхай яна будзе праклята!.. — // Міхал тут плюнуў, завярнуўся — // Хоць раз, ды добра агрызнуўся!”* [2, с. 88].

Чалавек для беларускага мастака слова ёсць адзінства суб'ектыўных і аб'ектыўных фактараў яго быцця. Коласаўскі герой жыве ў традыцыйнай форме быцця масавага чалавека, але праблема духоўнай свабоды для яго становіцца прыярытэтнай. Вось як глядзіць Міхал на ўласнае жыццё: *“Жывеш, ліпіш, як на калу ты, // І ногі й рукі ўдзеты ў путы. // А подзьме вецер, і ўсё бухне, // І ўсё старанне тваё рухне”* [2, с. 29]. Міхал не прымае сацыяльны бок светабудовы, але ён частка яе: працуе, дагаджаючы панам, выконваючы іх капрызы, пераязджае з абжытага месца, звяртаецца па пазыку ў зямельны банк.

Для рэпрэзентацыі паняцця *свабода* Якуб Колас выбірае лексічна супрацьлеглае *несвабода.* Паняцце *несвабода* раскрываецца падрабязна як у змястоўным плане (пярэбары, уладкаванне на новым месцы, фінансавыя цяжкасці і інш.), так і асацыятыўна-вобразным (пажар, хвароба Міхала, гібель ваўка). Свабода для Міхала і Антося — гэта іх маральны выбар, усвядомленная неабходнасць, якая прымушае дзейнічаць у адпаведнасці з пастаўленымі мэтамі і інтарэсамі: *“Цярпі! чаму? дакуль цярпенне? // Калі канец яму, рушэнне? // Няўжо ўвесь век жыць з панскай ласкі // І перад ім*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*чуць абавязкі? // І слугаваць яму, старацца // І ў тры пагібелі згінацца?”* [2, с. 100].

Якуб Колас праблему свабоды суадносіць з праблемай адказнасці чалавека за свой выбар. Менавіта гуманістычны аспект адказнасці Міхала становіцца яго жыццясцвярджальным прынцыпам і, паміраючы, герой дае наказ брату: *“Зямля… зямля… туды, туды, брат, // Будуй яе… ты дай ёй выгляд… // На новы лад, каб жыць нанова… // Не кідай іх……….* [2, с. 296].

Пачуццё адказнасці Міхала характарызуе яго як чалавека, які ўсвядоміў свой выбар. У “Новай зямлі” пачуццё адказнасці становіцца катэгорыяй маральнай. Такім чынам, духоўная свабода, у разуменні Якуба Коласа, павінна быць падпарадкавана найперш маральным каштоўнасцям.

Гісторыя развіцця цывілізацыі мяжы XX — XXI стст. паказвае, што прырода чалавека больш трагічная і супярэчлівая, чым падавалася раней. Якуб Колас, як вынікае з паэмы “Новая зямля”, не прыхільнік народнага калектывізму (у вёску сям'я Міхала не хоча вяртацца): *“А ў Мікалаўшчыну вярнуцца — // Ўжо лепей тут як-небудзь ткнуцца, // Бо там — галда, там шум, цяснота, // І не бярэ ніяк ахвота // Туды зноў ехаць, будавацца…* [2, с. 75–76]. Куды больш важнай для пісьменніка з'яўляецца ідэя ўласнай духоўнай аўтаноміі: *“І не належаць ні да кога, // Не знаць начальства ніякога”* [2, с. 25]. Паэма пісалася аўтарам у складанай атмасферы дарэвалюцыйных і пасляравалюцыйных падзей: асоба чалавека набывала выключную адказнасць за ўласную сувярэннасць. Настаўніцкая праца давала багаты жыццёвы матэрыял пісьменніку для роздуму.

Важную сэнсавую нагрузку ў змесце паэмы нясе сцэна з ваўком, які сімвалізуе свабоду, вольнасць, але, трапіўшы ў стрыжэнь, звер гіне. Гібель ваўка пакідае ў душы Міхала супярэчлівыя пачуцці-роздум: што ёсць жыццё, выпадак, у чым сіла, слабасць, сэнс змагання? *“Глядзіць, як бы ратунку просіць… // Цьфу ты! аж шкода яго стала — // Так вочы жаласна глядзяць, // Ну, вось, даль-бог, шкада страляць!”* [2, с. 159].

Шкадаванне ваўка Міхалам ёсць выказванне павагі да свабоды іншага, што сведчыць пра паглыбленае разуменне ўласнай свабоды. У перадсмяротных трызненнях герой убачыць сябе тым самым ваўком у стрыжэні, якому ўжо ніхто не дапаможа. Так метафарычна Колас выказвае думку аб адзінстве чалавека і прыроды, аб новым узроўні светаўспрымання Міхала.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Неспадзяваная хвароба фарміруе новыя адносіны Коласавага героя да жыцця: востра паўстаюць пытанні жыцця і смерці, правільнага выбару, людскога лёсу, боскай Волі: *“Няўжо памру і стану трупам, // Згнію ў зямлі нікчэмным струпам // На целе гэтае зямлі?” // І цені страшныя ляглі // Яму на душу і на сэрца, // І ён так ясна, бы ў люстэрцы, // Убачыў смерці ўсе пячаці // І ўсе адзначныя пастаці. // Міхал адчуў, што ён — пылінка, // А век людскі — адна хвілінка”* [2, с. 287].

Падыход Якуба Коласа да праблемы свабоды звязаны не толькі з даследаваннем сукупнасці аб'ектыўных якасцяў чалавека, але і з іх аналізам праз свядомасць самага героя. Пісьменнік здолеў паказаць не толькі, кім з'яўляецца герой аб'ектыўна, але і як ён сам сябе ўсведамляе. Менавіта праз духоўнае вызваленне Міхал рэалізуе сябе як асобу (“Духовное освобождение человека есть реализация личности в человеке” [1, с. 206], — пісаў М. Бярдзяеў).

Такім чынам, свабода ў разуменні Якуба Коласа — арганічны складнік асобы, які яднае мараль і духоўнасць, і праз прызму антрапалагічнага аспекта беларускі пісьменнік раскрыў яе этычны складнік у “Новай зямлі”.

**Літаратура:**


1. Бердяев, Н. О рабстве и свободе человека: опыт персоналистической философии / Н. Бердяев. – Париж : YMCK-Press, 1972. – 222 с.
2. Колас, Я. Збор твораў : у 20 т. / Я. Колас ; рэдкал.: М.У. Мясніковіч і інш. ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – Т. 8 : Паэма “Новая зямля” / рэд. М.І. Мушынскі ; падрыхт. тэкстаў і камент. Э.А. Золавай. – 347 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ